Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі
Пружанскага райвыканкама

Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"

## Навукова-практычная канферэнцыя

# "Падзеі Першай сусветнай вайны ў лёсе Заходняй Беларусі"

## Зборнік дакладаў

***25 – 26 красавіка 2014 г.***



МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ПРУЖАНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

МУЗЕЙ-СЯДЗІБА "ПРУЖАНСКІ ПАЛАЦЫК"

# Навукова-практычная канферэнцыя

# "Падзеі Першай сусветнай вайны ў лёсе Заходняй Беларусі"

(да 100-годдзя з пачатку Першай сусветнай вайны)

## Зборнік дакладаў
## 25 – 26 красавіка 2014 г.

Брэст 2014

**УДК** 94(476)
**ББК** 63.3(4 Беи)534-68

**Рэцэнзент:**
*Піваварчык Сяргей Аркадзьевіч, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УА «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы» (Беларусь).*

**Навуковы камітэт:**

**Старшыня** – *Грабёнкін Ігар Мікалаевіч, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Расіі Разанскага дзяржаўнага універсітэта імя С.А. Ясеніна (Расія).*

**Сустаршыні** – *Зялевіч Юрый Сяргеевіч, дырэктар музея-сядзібы "Пружанскі палацык",*
*Акульшын Петр Уладзіміравіч, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык навукова-адукацыйнага цэнтру гісторыка-гуманітарных і сацыяльна-эканамічных даследаванняў Разанскага дзяржаўнага універсітэта імя С.А. Ясеніна (Расія)*

**Адказны сакратар** – *Пракаповіч Наталля Сяргееўна, галоўны захавальнік фондаў музея-сядзібы "Пружанскі палацык".*

**Член камісіі** – *Дзямідаў Сяргей Юрьевіч, спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пружанскга раённага выканаўчага камітэта.*

Даклады навукова-практычнай канферэнцыі прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны 1914 – 1918 гг. на тэрыторыі Беларусі. Разлядаецца шэраг актуальных пытанняў.

Зборнік прадстаўляе цікавасць для выкладчыкаў і настаўнікаў гісторыі, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй.

**На вокладцы:** помнік Першай сусветнай вайны ў в.Слабудка Пружанскага раёна

**УДК** 94(476)
**ББК** 63.3(4 Беи)534-68

ISBN978-985-493-315-3

© Музей-сядзіба "Пружанскі палацык", 2014
© Выдавецтва БрДзТУ, 2014

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беі)534-68

*А.М. Вабішчэвіч (г. Брэст)*

# *ВОІНСКІЯ ПАХАВАННІ ПЕРЫЯДУ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ НА ПАЛЕССІ: СТАН І ЗАХАВАННЕ Ў 1921–1939 гг.*

На сучасным этапе ў Беларусі надаецца асаблівая ўвага праблеме ўшанавання памяці воінаў Першай сусветнай вайны. На жаль, у савецкі час гэтая "імперыялістычная" вайна, якая прынесла беларускім землям велізарныя людскія страты і разбурэнні, не атрымоўвала належнай ацэнкі. На працягу многіх дзесяцігоддзяў воінскія пахаванні перыяду Першай сусветнай вайны былі незаслужана занядбаны. Аднак першыя захады па захаванні і добраўпарадкаванні вайсковых могілак пачалі ажыццяўляцца ў заходняй частцы Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы з перш. пал. 1920-х гг. Паспрабуем прасачыць гэта на прыкладзе Палескага ваяводства.

Для польскіх улад міжнародныя абавязкі аб наглядзе за воінскімі пахаваннямі ўтрымліваліся ў Версальскім дагаворы ад 28 чэрвеня 1919 г. Гарантыя паважлівых адносін і падтрымання ў парадку магіл пахаваных была замацавана ў арт. 225 Версальскага дагавора. Былыя варагуючыя бакі згадзіліся задавальняць просьбы аб перазахаванні загінуўшых у адпаведнасці з палажэннямі нацыянальнага заканадаўства і патрабаваннямі аховы здароўя. Арт. 226 прадугледжваў узаемныя абавязацельствы прадстаўлення спісаў загінуўшых з усей інфармацыяй, неабходнай для ўстанаўлення іх асобаў, звестак аб колькасці і месцазнаходжанні пахаванняў.[1] Пэўныя абавязацельствы ўтрымліваў Рыжскі дагавор, які Польшча падпісала 18 сакавіка 1921 г. з РСФСР і УССР. Клопат пра воінскія пахаванні быў замацаваны ў арт. IX (п. 3) Рыжскага дагавора. "Два бакі, што дагаворваюцца, абавязваюцца паважаць і адпаведным чынам утрымліваць магілы ваеннапалонных, памерлых у палоне, магілы салдат, афіцэраў і іншых ваеннаслужачых, якія загінулі ў баях і пахаваны на іх тэрыторыях. Бакі абавязваюцца далейшым дазваляць, паводле пагаднення з мясцовымі ўладамі, устаноўку помнікаў на магілах, эксгумацыю і вываз на радзіму астанкаў нябожчыкаў па ільготнаму тарыфу і пры захаванні пастаноў і правіл унутранага заканадаўства і патрабаванняў народнай аховы здароўя".[2]

Па распараджэнню польскага ўрада 27 жніўня 1922 г. пытанні нагляду за воінскімі пахаваннямі і могілкамі былі ўскладзены на Міністэрства грамадскіх работ Польшчы. Адпаведныя дакументальныя матэрыялы былі перададзены яму 30 снежня 1922 г. ад Галоўнага ўпраўлення апекі за воінскімі пахаваннямі Міністэрства вайсковых спраў Польшчы. На падставе асобнага рэскрыпта Міністэрства грамадскіх работ з 1 студзеня 1923 г. у Брэсце пры мясцовай акруговай дырэкцыі грамадскіх работ быў створаны асобны сектар воінскіх пахаванняў, якому перайшлі ад камандавання корпуса акругі № 9 (г. Брэст) і камандавання корпуса акругі № 2 (г. Люблін) адпаведныя дакументы, што датычылі воінскіх пахаванняў і могілак. Палескі ваявода С. Даўнаровіч асобным цыркулярам ад 22 лютага 1923 г. загадаў павятовым старастам, органам павятовай дзяржаўнай паліцыі, праўленням гмін аказваць дапамогу і падтрымку структурам, звязаным з клопатам пра воінскія пахаванні, пры выкананні імі службовых абавязкаў.[3]

---

[1] Версальскі дагавор 1919 г. [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.documentarchiv.de/-wr/vvo6.html. – Дата доступа: 15.02.2014.
[2] Рыжскі дагавор 1921 г. [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://poland1939.ru/content/ctatya-ix-rizhskogo-dogovora-1921-g. – Дата доступа: 16.02.2014.
[3] ДАБВ. – Ф. 2001. – Воп. 4. – Спр. 1320. – Л. 13.

У складаных умовах пасляваеннага часу на месцах назіраліся асобныя выпадкі парушэння цэласнасці вайсковых могілак. Таму 30 ліпеня 1923 г. палескі ваявода Даўнаровіч накіраваў павятовым старастам цыркуляр, у якім выказаў незадавальненне пахаваннем нябожчыкаў на існуючых вайсковых могілках. "У час абмеру вайсковых могілак і магіл у некалькіх паветах ваяводства было заўважана, што вясковае насельніцтва хавае сваіх нябожчыкаў на вайсковых могілках, раскопвае і знішчае пры гэтым воінскія магілы, бо размяшчае магілы на сцежках могілак ці паміж рэгулярна размешчанымі магіламі, чым псуецца агульны выгляд і парадак на могілках. Таму некаторыя вайсковыя могілкі, якія былі пакінуты акупантамі ў належным стане, губляюць свой выключна воінскі характар і падвяргаюцца павольнаму спусташэнню (напрыклад, нямецкія вайсковыя могілкі каля казарм у Лінове Пружанскага павета)".[4] Менавіта таму было катэгарычна забаронена далейшае пахаванне на вайсковых могілках нябожчыкаў з ліку грамадзянскіх асоб. Такое распараджэнне трэба было давесці да сельскіх гмін, магістратаў, а таксама органаў дзяржаўнай паліцыі. У выпадку выяўлення свежых магіл прадугледжвалася эксгумацыя грамадзянскіх нябожчыкаў і перапахаванне іх на прыходскіх могілках за кошт сродкаў гмін і віноўнікаў.[5]

У пач. студзеня 1927 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне накіравала ўсім павятовым сеймікам ліст з пратаколам управы агульнапольскага Таварыства апекі за магіламі загінуўшых з прадпісаннем адносна ўзмацнення нагляду за магіламі і ўключэнні для гэтага ў бюджэт неабходных сродкаў.[6] Павятовыя ўлады далі адпаведныя ўказанні вясковым гмінам. З улікам наяўных магчымасцей там былі зроблены канкрэтныя захады. Напрыклад, рада Столінскай гміны на сваім пасяджэнні 18 жніўня 1927 г. прыняла рашэнне аб унясенні дапаўнення да ўласнага бюджэту на 1927/1928 гаспадарчы год якраз для ўзмацнення нагляду за пахаваннямі ў квоце 100 злотых.[7]

Пры падтрымцы акруговай дырэкцыі грамадскіх работ намаганнямі мясцовай грамадскасці на вайсковых могілках праводзілася добраўпарадкаванне. Так, у 1927 г. быў праведзены рамонт могілак, 2 могільных брамкі у в. Невель Пінскага павета. Была ачышчана паверхня плошчай 1265 м², 32 магілы (495,7 м²). Праведзеныя работы былі ацэнены ў 193,5 злотых. У Кухоцкай Волі Пінскага павета адпаведна было ачышчана 1204 м², 124 магілы (264,8 м²), а работы каштавалі 208 злотых.[8] Розныя па аб'ему работы па добраўпарадкаванні адбываліся і на іншых могілках.

У многіх мясцовасцях індывідуальныя драўляныя крыжы былі заменены надмагіллямі – плоскімі намагільнымі плітамі ў форме стылізаванага крыжа ці вертыкальнымі бетоннымі крыжамі. Надпісы з крыжоў пераносіліся на бетонныя надмагіллі звычайна на польскай мове (па міжнародных патрабаваннях на мове краіны, дзе змешчаны воінскія пахаванні) ці па-нямецку (пажаданне нямецкага боку аб пахаваннях нямецкіх ваеннаслужачых). Надпісы на рускай мове былі выключэннем.

Па складзеных актах выкананых работ ад 27 лістапада 1928 г. за бетонныя надмагіллі на могілках у весках Пінскага павета прадугледжвалася выплата Б. Фінкелю 658 злотых за 140 надмагілляў у в. Жытновічы (нямецкія воінскія пахаванні), 747,3 злотых за 159 надмагілляў у в. Ніговішча (зараз у Зарэчненскім раене Ровенскай вобл. Украіны), 65,8 злотых за 14 надмагілляў у в. Жыдча (нямецкія воінскія пахаванні). Кошт 1 надмагілля складаў 4,7 злотых.[9] На плітах выбіваліся літары з абрэвіятурай Міністэрства грамадскіх работ Польшчы (Ministerstwo Robot Publicznych) і пазначэннем года – "MRP 1928".[10]

---

[4] Там жа. – Л. 21.
[5] Там жа.
[6] Там жа. – Ф. 2187. – Воп. 1. – Спр. 243. – Л. 16.
[7] Там жа. – Л. 5.
[8] Там жа. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 1314. – Л. 83.
[9] Там жа. – Спр. 1994. – Л. 20 адв., 21 – 21 адв., 22 – 22 адв., 23 – 23 адв.
[10] Lewkowska, A. Zabytkowe cmentarze na kresach wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej: Województwo Poleskie na obszarze Republiki Białoruś. – Warszawa, 2000. – S. 208.

Сярод упарадкаваных пры падтрымцы Міністэрства грамадскіх работ Польшчы ў тым жа 1928 г. былі і сумесныя воінскія пахаванні расійскай, нямецкай і аўстра-венгерскай арміі у в. Паляцічы Прускай гміны Кобрынскага павета.[11] Пра гэта сведчаць надпісы на бетонных плітах. На некаторых нямецкіх магілах і на ўсіх расійскіх пахаваннях зроблены надпісы па-польску.[12]

На тэрыторыі Брэсцкага павета добраўпарадкаванне з удзелам нямецкага боку было праведзена на змешаных вайсковых могілках (нямецкія, аўстра-венгерскія і расійскія пахаванні) у Тамашоўцы. З таго часу дайшлі да сучаснасці 1262 індывідуальныя і 12 брацкіх магіл (усяго пахавана 1346 чал.).[13] Воінскія пахаванні аўстра-венгерскай арміі былі размешчаны на каталіцкіх могілках у Высока-Літоўску.

У ходзе ўзаемадзеяння акруговай дырэкцыі грамадскіх работ з мясцовымі гміннымі органамі ўлады ўзнікалі непаразуменні. У цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў (МУС) Польшчы 9 мая 1928 г. прадпісвалася ваяводам выдаць распараджэнні мясцовым уладам па пытаннях, звязаных з захаваннем воінскіх пахаванняў: аб большай падтрымцы з боку гмінных праўленняў для персаналу ваяводскіх упраўленняў, сектараў воінскіх пахаванняў пры найме работнікаў і фурманак для рамонтных работ на вайсковых могілках і правядзення эксгумацыі магіл; аб праяўленні больш пільнага клопату на ўзроўні гмін па недапушчэнні на вайсковых могілках наўмыснага знішчэння агароджаў, крыжоў, намагільных пліт; аб прыцягненні да адказнасці гмінных улад за ўхіленне ад удзелу ў складванні ў іх прысутнасці служачымі па воінскіх пахаваннях актаў прыемкі выкананых работ на могілках, пры складванні пратаколаў эксгумацыі магіл; аб правядзенні органамі паліцыі строгага кантролю за тым, каб без згоды адпаведных ваяводскіх органаў на тэрыторыю вайсковых могілак не ўваходзілі для іх наведвання замежныя асобы, не праводзіліся там якія-небудзь работы ці фатаграфаванне магіл.[14]

Увага з нямецкага боку да воінскіх пахаванняў суайчыннікаў у Польшчы выклікала незадавальненне яе ўлад. "На тэрыторыі Польшчы знаходзіцца вельмі многа могілак з пахаванымі ў іх нямецкімі салдатамі, якія загінулі ў час сусветнай вайны. Гэтыя могілкі і асобныя магілы з'яўляюцца прадметам жывой зацікаўленасці не толькі сем'яў і сяброў загінуўшых, але таксама розных нямецкіх таварыстваў ў Германіі і нямецкага ўрада", – паведамлялася ў цыркуляры МУС Польшчы 9 жніўня 1929 г.[15] Адзначалася, што "некаторыя прыватныя асобы, кіраўнікі гмін ці нават гмінныя праўленні не пераставалі быць заклапочанымі рознымі просьбамі нямецкага боку аб рамонце могілак і пахаванняў, прыбіранні, фатаграфаванні, вырабе планаў і інш., на выкананне чаго атрымоўвалі грошы ці абяцанні аб аплаце".[16] Каб "збіць" такую масіраваную хвалю актыўнасці з боку немцаў, было загадана адсылаць назад іх карэспандэнцыю і грошы з тлумачэннем, што наглядам за могілкамі і пахаваннямі загінуўшых нямецкіх салдат займаліся польскія дзяржаўныя ўлады, накіроўваць іх са сваімі пажаданнямі да адпаведных польскіх консулаў. У МУС Польшчы былі ўпэўнены, што пры безумоўным выкананні такіх прадпісанняў "нямецкая практыка" з цягам часу страціць сваё значэнне і мэтанакіраванасць.

Разам з устаноўкай намагільных пліт, абеліскаў, агароджаў, добраўпарадкаваннем воінскіх пахаванняў адбывалася таксама перазахаванне адзінкавых ці нешматлікіх пахаванняў у больш буйныя. Аднак рэалізацыі гэтых планаў перашкаджаў недахоп фінансавых сродкаў, асабліва пад уплывам сусветнага эканамічнага крызісу 1929 г. Як паведамляла 18 ліпеня 1933 г. Палескае ваяводскае ўпраўленне ў Пінскага павятовага

---

[11] Шарков, А. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси / Soldatengräberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus. – Мн., 2010. – С. 31.

[12] Lewkowska, A. Zabytkowe cmentarze na kresach wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej... – Warszawa, 2000. – S. 149.

[13] Шарков, А. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси Soldatengräberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus ... – С. 129.

[14] ДАБВ. – Ф. 36. – Воп. 1. – Спр.40. – Л. 9.

[15] Там жа. – Спр.41. – Л. 10.

[16] Там жа.

старосства, з-за запланаваных рамонтаў, работ па камасацыі зямель на тэрыторыі Пінскага павета неабходных сродкаў (628 злотых) для добраўпарадкавання мясцовых воінскіх пахаванняў не было. "... Большая частка вайсковых могілак у Пінскім павеце падлягае скасаванню. З 59 вайсковых могілак ... застаюцца 8, становішча якіх паводле справаздачы было добрым".[17] Менавіта добрым прызнаваўся стан воінскіх пахаванняў у весках Жытновічы (32 магілы) і Невель (32 магілы), а сярэднім – у весках Ніговішча (34 магілы), Жыдча (10 магіл).[18]

Лепшым было добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў, якія размяшчаліся ў населеных пунктах (нярэдка на тэрыторыі ці збоку прыходскіх грамадзянскіх могілак, каля цэркваў) або ў блізкай адлегласці ад іх. У аддаленых месцах пераважалі магілы з драўлянымі крыжамі, агароджаныя. Напрыклад, 3 такія магілы знаходзіліся ў 3-х вярстах ад в. Кухоцка Воля II Пінскага павета ў лесе ва ўрочышчы Асіна, а 4 – у 3-х вярстах ад в. Кухоцка Воля I ў полі ва ўрочышчы Клішава. Некаторыя аддаленыя пахаванні не мелі крыжоў (напрыклад, 6 магіл у фальварку Паўлінава той жа гміны Кухоцка Воля Пінскага павета – зараз гэтыя землі ў складзе Украіны).[19] Як правіла, такія пахаванні з цягам часу былі занядбаны і цяпер іх немагчыма адшукаць.

Яшчэ больш трывожнай тады была справа з пахаваннямі бежанцаў. 11 чэрвеня 1933 г. быў выдадзены асобны цыркуляр МУС Польшчы адносна становішча пахаванняў бежанцаў 1915 г. Прызнавалася, што "...магілы бежанцаў дасюль знаходзяцца на палях і ў лясах без належнага нагляду".[20] Напрыклад, у маентку Парэчча Пінскага павета было 26 магіл невядомых цывільных бежанцаў. Стан 23 з іх прызнаваўся добрым, 3 – дрэнным.[21]

Найбольшая колькасць воінскіх пахаванняў размяшчалася ў тых мясцовасцях Палесся, дзе ў 1915 – 1918 гг. праходзілі баявыя дзеянні на лініі фронту. Шматлікімі былі воінскія пахаванні ўздоўж Агінскага канала па абодва яго бакі – у Пінскім і Косаўскім паветах. На Піншчыне было не менш 50 такіх пахаванняў, з якіх уцалелі да цяперашняга часу каля 20 – у г. Пінску, а таксама ў весках Бакінічы, Дубай, Жабчыцы, Жыдча, Жытновічы, Местковічы, Мокрая Дубрава, Лагішын, Невель, Парэчча, Сошна, Сташаны і інш.[22] Сярод уцалелых пераважаюць нямецкія ці змешаныя вайсковыя могілкі. Напрыклад, на могілках у парку ў в. Дубай Пінскага павета было 63 магілы, сярод якіх нямецкіх – 39, расійскіх – 22 (у т.л. 11 невядомых), не ўстаноўлена вайсковая прыналежнасць – 2.[23] У 1936 г. на вайсковых могілках у в. Невель Пінскага павета, дзе былі нямецкія і расійскія пахаванні, каля ўвахода была ўсталявана стэла з надпісамі на нямецкай і рускай мовах: "Freund und feind im tod vereint", "Друзья и враги смертью соединены", "Errichtet zur ehre derer die fur ihr vater land starren", "Воздвиженъ въ память погибшихъ съ честью за Отечество 1917". Сярод арыгінальных дэкаратыўных дэталяў помніка сярод іншых вылучаўся лаўровы вянок з паходняй усярэдзіне.[24] У Косаўскім павеце нямецкія воінскія пахаванні былі ў Целяханах (на каталіцкіх могілках), Святой Волі, а змешаныя (нямецкія, аўстра-венгерскія, расійскія) – у Няхачава, каля Бярозы-Картузскай.[25]

---

[17] Там жа. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 5430. – Л. 18.
[18] Там жа. – Л. 13.
[19] Там жа. – Спр. 879. – Л. 16.
[20] Там жа. – Спр. 5424. – Л. 28.
[21] Там жа. – Л. 22.
[22] Ильенков, В. «Друзья и враги смертью соединены» // Пінскі веснік. – 1998. – 1 верасня; Ільянкоў, В. Ворагаў, аб'яднаных смерцю // Чырвоная змена. – 1999. – 23 сакавіка; Шарков, А. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси / Soldatengräberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus ... - С. 138–142.
[23] ДАБВ. – Ф. 2428. – Воп. 1. – Спр. 120. – Л. 1.
[24] Lewkowska, A. Zabytkowe cmentarze na kresach wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej... – Warszawa, 2000. – S. 118; Шарков, А. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси / Soldatengräberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus ... - С. 44.
[25] Шарков, А. Воинские захоронения Первой мировой войны в Беларуси Soldatengräberanlagen aus dem Ersten Weltkrieg in Belarus ... - С. 131 – 132.

У Драгічынскім і Пружанскім паветах таксама пераважалі нямецкія ці змешаныя пахаванні. Так, на Пружаншчыне нямецкія воінскія пахаванні раскінуліся каля Ружан, Муравы, а змешаныя – у Пружанах (нямецкія, аўстра-венгерскія і расійскія пахаванні каля каталіцкіх могілак) і Слабодцы (нямецкія, расійскія і польскія пахаванні).[26]

На тэрыторыі Столінскага павета вайсковыя могілкі былі закладзены ў 1915 г. у Відзіборы. Менавіта на чыгуначнай ст. Відзібор у прыфрантавой зоне з восені 1915 г. размяшчаліся буйныя склады зброі, боепрыпасаў, будматэрыялаў 3-й расійскай арміі. Праз станцыю ў час Брусілаўскага прарыву 1916 г. на ўсход рухаліся эшалоны з параненымі, у адваротны бок – з папаўненнем і боепрыпасамі.[27] 25 лістапада 1925 г. войт гміны ў Століне паведамляў мясцоваму павятоваму старасце, што "вайсковыя могілкі былой расійскай арміі каля маентка Відзібор былі ў дрэнным стане".[28] Яны займалі плошчу 1/3 дзесяціны, паводле няпоўных звестак Столінскай гміннай управы там было 30 магіл, якія не былі тады абгароджаны.[29] Паводле звестак 1927 г., у Відзіборы колькасць воінскіх магіл складала 61, на 46 з якіх адсутнічалі крыжы, але могілкі былі абгароджаны жэрдзямі. Гмінныя ўлады абяцалі ў бліжэйшы час паставіць крыжы.[30] Гэтыя воінскія пахаванні да цяперашняга часу не захаваліся.

Застаецца невядомым для сучаснікаў 1 нямецкае воінскае пахаванне на праваслаўных могілках у Століне. У магіле быў пахаваны камандзір 82-й нямецкай рэзервовай дывізіі генерал-маер Карл Фрыдрых Зігфрыд Фабарыус. Ен быў захоплены ў палон у ходзе нападу расійскіх дыверсійных атрадаў у кан. лістапада 1915 г. на штаб нямецкіх войскаў у фальварку Невель Пінскага павета,[31] аднак зрабіў самагубства. Тады яму ішоў 63-ці год (нар. 22 жніўня 1853 г. у Саарлуісе ў евангелісцкай сям'і). З'яўляўся кадравым прускім афіцэрам, які зрабіў нядрэнную вайсковую кар'еру. Службу ў арміі пачаў у 21 год на пасадзе кандыдата ў афіцэры ў 19-м палявым артылерыйскім палку ў г. Эрфурт. Прасоўванне па ўзыходзячай па камандных пасадах афіцэра-артылерыста (1876 г. – лейтэнант; 1891 г. – капітан; 1906 г. – падпалкоўнік; 1909 г. – палкоўнік) суправаджалася вучобай у афіцэрскіх школах, Прускай ваеннай акадэміі (1885 – 1888 гг.). За сваю добрую службу быў адзначаны ордэнамі Чырвонага арла IV ступені з каронай (1897 г.) і з лукам (1911 г.), прускім крыжом (1900 г.) і іншымі ганаровымі вайсковымі ўзнагародамі. І нарэшце ў кастрычніку 1912 г. атрымаў званне генерал-маера.[32] У пач. Першай сусветнай вайны 82-я рэзервовая дывізія пад яго камандаваннем ваявала на заходнім фронце ў раене р. Сома. А ў красавіку 1915 г. яна была перакінута на ўсходні фронт, дзе прымала ўдзел у Горліца-Тарноўскай наступальнай аперацыі, пераправілася цераз р. Сан, удзельнічала ў баях за Перамышль, Львоў. Менавіта гэтая нямецкая дывізія заняла Брэст-Літоўск, Пінск. А з восені 1915 г. у пінскіх балотах пачалася пазіцыйная вайна, якая працягвалася да пач. 1918 г.

14 мая 1934 г. кіраўнік будаўнічага аддзела Палескага ваяводскага ўпраўлення, інжынер К. Сакалоўскі паведамляў у Столінскае павятовае староства аб тым, што "нямецкае пасольства прыняло просьбу Гарвіцкага аб 60 злотых для выканання работ, звязаных з упарадкаваннем і ўпрыгожваннем магілы нямецкага генерала

---

[26] Там жа. – С. 45 – 46, 142 – 144.
[27] Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Столінскага раена. – Мн., 2003. – С. 87.
[28] ДАБВ. – Ф. 2003. – Воп. 2. – Спр. 453. – Л. 21.
[29] Там жа. – Воп. 1. – Спр. 224. – Л. 14.
[30] Там жа. – Л. 20, 22.
[31] Аб правядзенні гэтай аперацыі гл.: Брусилов, А.А. Мои воспоминания. Мемуары. – Мн., 2002. – С. 202–203; Заворошкин, В. Партизаны Первой мировой // Белорусская военная газета. – 2006. – 28 октября; Заворошкин, В. Как пленили генерала Фабариуса // Полесская правда. – 2007. – 24 ноября, 1, 8 и 15 декабря; Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914 – 1918 гг. – Пінск, 2010. – С. 203 – 204.
[32] Karl Friedrich Siegfried Fabarius. [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://de.wikipedia.org/wiki/-Karl_Friedrich_Siegfried_Fabarius. – Дата доступа: 13.10.2012.

З. Фабарыуса, пахаванага на прыходскіх могілках у Століне". Пры гэтым ен прасіў В. Гарвіцкага прыступіць да названых работ, прасачыць аб выкананні іх "салідна і ў строгай адпаведнасці з прынятым праектам, каб быў чытабельны, эстэтычны наступны надпіс на магільнай пліце:

Siegfried Fabarius
Königl. Preuss Generalmajor
* 22.VIII.1853 + 30.XI.1915"[33].

Нямецкае пасольства ў Варшаве замовіла 6 фотакартак (фармату паштовак) магілы генерала З. Фабарыуса пасля правядзення там рамонту.

Улічваючы тое, што гэтым пытаннем непасрэдна цікавіліся нямецкія дыпламаты, то польскімі ўладамі быў наладжаны пільны кантроль за яго вырашэннем. З Брэста ад транспартна-будаўнічага аддзела Палескага ваяводскага ўпраўлення ў Столінскае павятовае староства ішлі лісты з просьбай паведаміць, ці прыступілі ўжо да ўпарадкавання воінскага пахавання і калі гэтыя работы будуць завершаны.[34] Пасля сканчэння рамонтных работ 18 ліпеня 1934 г. быў складзены адпаведны акт прыемкі. "Камісія ў складзе Ю. Палюшкевіча, падрэферэнта Столінскага павятовага староства, і А. Карнялюка, тэхніка дарожнага аддзела Столінскага павета, сёння пасля агляду на месцы на праваслаўных могілках у Століне упарадкаванай В. Гарвіцкім магілы нямецкага генерала З. Фабарыуса сцвярджае, што магіла ўпарадкавана і ўпрыгожана паводле праекта...".[35]

Інтарэс нямецкага боку да загінуўшых суайчыннікаў не спадаў да кан. 1930-х гг. Так, 13 ліпеня 1936 г. транспартна-будаўнічы аддзел Палескага ваяводскага ўпраўлення прасіў пінскага павятовага старасту выдаць распараджэнне аб пошуках магілы нямецкага унтэр-афіцэра Карла Левіцке (Loewicke Karl), які памер 23 верасня 1915 г. "Паводле даных, атрыманых з нямецкага пасольства, магіла павінна знаходзіцца ў Лагішыне пры касцеле ці царкве".[36] Праз 2 тыдні – 27 ліпеня 1936 г. – управа гміны ў Лагішыне дакладвала ў Пінск павятовому старасце наступнае: "У Лагішыне есць агульная магіла нямецкіх і расійскіх салдатаў, але надпісаў і надмагілляў няма. Т.я. ніхто з жыхароў не прысутнічаў пры пахаванні забітых салдат, то нельга ўстанавіць ці ен там пахаваны. У магіле пахавана нібы некалькі соцен салдат...".[37] Пасля праведзенага разбірацельства 31 жніўня 1936 г. было дададзена: "... Былі праслуханы старэйшыя людзі, якія ў той час былі на тэрыторыі баявых дзеянняў. ... Знайсці магілу К. Левіцке немагчыма, бо ніхто з мясцовых жыхароў яго не ведаў, таксама на яго магіле, як і іншых салдат, няма надпісаў".[38]

У цэлым, у 1921 – 1939 гг. на тэрыторыі Палескага ваяводства намаганнямі польскіх дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, органаў гарадскога і вясковага самакіравання, царкоўных структур розных веравызнанняў і мясцовых жыхароў, а таксама замежных таварыстваў і грамадзян (асабліва нямецкіх), праводзілася захаванне і добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў незалежна ад дзяржаўнай прыналежнасці загінуўшых. Аднак трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, актыўная пасляваенная гаспадарчая дзейнасць і ўрбанізацыя, уздзеянне навакольнага асяроддзя, праявы абыякавых адносін да мемарыяльных помнікаў "імперыялістычнай" вайны і іншыя фактары прывялі да страты многіх з тых пахаванняў. Таму цяпер неабходна пастарацца захаваць уцалелыя матэрыяльныя, дакументальныя сведчанні аб ахвярах Першай сусветнай вайны для наступных пакаленняў.

---

33 ДАБВ. – Ф. 2003. – Воп. 1. – Спр. 1643. – Л. 3 адв.
34 Там жа. – Л. 16.
35 Там жа. – Л. 13.
36 Там жа. – Ф. 2001. – Воп. 1. – Спр. 5467. – Л. 2.
37 Там жа. – Л. 5.
38 Там жа. – Л. 7.